# ЦІ КОЖНАМУ ПАТРЭБНЫ ДЫПЛОМ?

## Лепш быць добрым слесарам, чым дрэнным інжынерам

**СЁННЯ школьнікаў актыўна арыентуюць на працоўныя прафесіі. Але ў свой час вышэйшая адукацыя стала амаль што нормай, і цяпер цяжка ад такога падыходу адмовіцца. Ці трэба адразу пасля школы спяшацца ў ВНУ або можна годна зарабляць, не маючы дыплома аб вышэйшай адукацыі — пра гэта некалькі гісторый.**

### УДЗЯЧНЫ БАЦЬКАМ, ШТО НЕ ЦІСНУЛІ

— Вучыўся я на моцныя 8-9, але па жыцці такі крыху разгільдзяй, — прызнаецца Андрэй. — Хлопцы ўжо ў восьмым класе распланавалі кар'еру, а я і да выпускнога не вызначыўся. Але ў мяне выдатныя продкі: спрабуй, шукай! Год да войска я то ў татавай будаўнічай фірме падвізаўся, то ў яго сябра ў офісе дапамагаў сісадміну. Зразумела, што маці, як усе жанчыны, не хацела, каб я ішоў у войска. А тата з дзедам сказалі: «У нас усе мужчыны служылі, і ты не горшы». Я і не ўпіраўся. Наогул, у ваенкамаце сказаў, што хачу ў пагранічныя войскі, але мяне накіравалі ў сувязісты. Бацькі часта прыязджалі, бо вельмі блізка ад дома служыў, часам і дадому на выхадны адпускалі. Самае галоўнае — былі талковыя афіцэры. Яны не казалі нам: ідзі і рабі, а тлумачылі, што, як і для чаго. І я захапіўся прафесіяй. Такая вось класічная гісторыя.

**«Якія высновы зрабіў? Удзячны бацькам, што не ціснулі на мяне, далі магчымасць самому выбраць цікавую справу. А вось у школе наша класная настройвала, што мы ўсе павінны паступіць, а калі хто не паступіць, той лузер».**

Пасля дэмбеля паступіў на інфакамунікацыйныя тэхналогіі. З першага курса па дробязі працаваў, а практычна сябе забяспечваў, з трэцяга — ужо меў сталую работу ў фірме татавага сябра, цяпер вось у холдынгу. Мне падабаецца, што тут трэба самаўдасканальвацца. Разумею, што гадоў праз 10-15 памяняю прафесію ці пайду ў нейкую сумежную вобласць. Гэта таксама цікава.

Якія высновы зрабіў? Удзячны бацькам, што не ціснулі на мяне, далі магчымасць самому выбраць цікавую справу. А вось у школе наша класная настройвала, што мы ўсе павінны паступіць, а калі хто не паступіць, той лузер.

Са мной у акадэміі вучыліся хлопцы, для якіх вышэйшая адукацыя — гэта магчымасць стаць кіраўніком. Мне ж зусім не цікава кіраваць людзьмі, мне падабаецца займацца тэхнікай, знаходзіць цікавыя рашэнні, нешта ўдасканальваць.

Мае бацькі кажуць, што ў іх часы адукацыя была больш якасная. Маўляў, не было інтэрнэту для спісвання. У чымсьці згаджаюся з імі. А ў мой час, лічу, трэба больш практыкі, вось літаральна з першага курса, каб чалавек разумеў, чым ён будзе займацца.

Ну і яшчэ мне падаецца, што лічыць сябе адукаваным чалавекам толькі з-за наяўнасці дыплома смешна. У найлепшым выпадку ты — спецыяліст. Адукацыя — гэта значна шырэй, перш за ўсё, пастаянная пазнавальная актыўнасць. Мяне проста выводзіць з сябе фраза, якую чамусьці любяць дзяўчаты, — «сушыла мазгі» ў ВНУ. Як толькі чую, адразу ўцякаю.

### У ВНУ ПАСТУПІЎ ДАРОСЛЫМ

— У нас у сям'і з вышэйшай адукацыяй цікава атрымліваецца ў апошніх пакаленнях, — кажа Іван Данілавіч. — Мае бацькі фактычна падлеткамі прыехалі аднаўляць Мінск пасля вайны. У юнацтве мне здавалася, што чалавек рабочай прафесіі ў грамадстве паважаны. Таму я таксама пайшоў на завод. Мусіць, пра такіх, як мае бацькі, потым казалі: працоўная эліта. Яны стараліся ўліцца ў гарадскую культуру, шмат чыталі. У нашай паштовай скрыні абавязкова былі «Вячэрні Мінск», «Звязда», часопісы «Беларусь», «Агонёк». Мне з братам выпісвалі піянерскія газеты, дзіцячыя і падлеткавыя часопісы. Насамрэч, дома былі кнігі, і ў бібліятэку ўсе запісаліся. Калі не адукаванымі, то зусім дзіраванымі людзьмі мы сябе сапраўды адчувалі. Але ж некаторыя ўсё роўна круцілі носам: маўляў, рабацягі — нізкая катэгорыя... Ну мы з жонкай і вырашылі, што пойдзем вучыцца. Зразумела, завочна.

Вядома, не шкадуем, што атрымалі хоць бы завочную адукацыю. Кар'ера цікава склалася, больш нейкіх магчымасцяў у жыцці з'явілася.

Сын вырашыў, што пасля школы пойдзе працаваць, — вельмі яму хацелася хутчэй стаць фінансава незалежным. Спачатку скончыў курсы і пачаў займацца будаўніцтвам катэджаў. Грошы зарабляў добрыя, але маральна з кліентамі было цяжка. Потым сышоў у сферу лагістыкі, якая толькі пачынала развівацца. Спачатку быў грузчыкам, камплектоўшчыкам, хутка дарос да старшага змены. І вось там быў сапраўды шыкоўны заробак, прычым ніякай ураўнілаўкі.

Аднойчы сын паехаў з сям'ёй у вандроўку за мяжу. У дарозе ад Мінска да Берліна людзі перазнаёміліся. Былі там дзяўчына і яе сяброўка — бухгалтары ў прыватных фірмах. Іх шакіравала, што за мяжу ездзяць работнікі складоў, будаўнікі, цырульнікі... Маўляў, як гэта людзі без адукацыі добра зарабляюць і яшчэ маюць магчымасць убачыць свет. Дарэчы, у сына на змене хапала камплектоўшчыкаў з вышэйшай адукацыяй. Неяк яму сказалі, што без якога-небудзь дыплома старшы змены — гэта мяжа. І ён паступіў ужо дарослым чалавекам таксама на завочнае, дакладна разумеючы, для чаго яму гэта патрэбна.

А калі мой сын павёў свайго сына ў першы клас, то потым дзяліўся з намі: «Бацькоў аднакласнікаў не цікавіць адукацыя, яны глядзяць, на якой машыне ты прыехаў».

Цяпер вось ужо старэйшаму ўнуку час думаць аб выбары прафесіі. Як усе яго аднагодкі, ён таксама сядзіць у гаджэтах. Сын з нявесткай дзяцей любяць, але ніколі не рабілі з іх прынцаў і прынцэс. Гадоў з 12 унук сам насіў у майстэрню свае красоўкі і іншы абутак. Побач з іх домам чатыры майстэрні, ён абышоў усе. Для нас было нечаканасцю, калі ўнук сказаў, што дамовіўся з адным з майстроў і на канікулах месяц папрацуе. Вопыт аказаўся паспяховым, і хлопец захацеў атрымаць такую прафесію. Пытаецца: не бянтэжыць нас «шавец» у сям'і? Сын смяецца: «Ты не забыў, што я быў грузчыкам? І толькі дзякуючы таму, што ведаю работу з першай прыступкі, маю права лічыць сябе эфектыўным кіраўніком».

Але ж... як сказаць аднакласнікам, што ты хочаш быць майстрам ці нават, як цяпер модна казаць, сэрвісменам па рамонце абутку? Цяпер жа модна ісці ў «айцішачку» ну ці «хоць якую вышэйшую атрымаць». Унук задае пытанне: «Барбер і шавец — сфера абслугоўвання, але чамусьці барберам быць крута, а рамантаваць абутак — не». Разам шукаем адказ.

**«Лічыць сябе адукаваным чалавекам толькі з-за наяўнасці дыплома смешна. У найлепшым выпадку ты — спецыяліст. Адукацыя — гэта значна шырэй, перш за ўсё, пастаянная пазнавальная актыўнасць».**



Прызнаюся, таемна падышоў у майстэрню, у якой унук практыкаваўся. Дык вось, гаспадар майстэрні сказаў, што рукі ў хлопца вельмі правільныя, добры густ, ёсць фантазія. Увогуле, ён можа стаць крутым майстрам ці прыйдзе да таго, што трэба вучыцца, каб быць дызайнерам-мадэльерам. А мне хочацца, каб ён займаўся тым, што яму даспадобы.

**«Ты не забыў, што я быў грузчыкам? І толькі дзякуючы таму, што ведаю працу з першай прыступкі, маю права лічыць сябе эфектыўным кіраўніком».**

Вельмі спадзяюся, што грамадства паступова пазбавіцца ад стэрэатыпаў і перастане дзяліць людзей на адукаваных і іншых.

### ЗАРОБАК МАЕ ЗНАЧЭННЕ

— Мая аднакласніца прыходзіла да мяне падзяліцца. Мама ледзь ці не гнала яе ў медуніверсітэт, — распавядае Марына. — Палохала «перспектывай»: кім Лена стане, калі не паступіць. А што рабіць 17-гадовай дзяўчыньцы? Лена паступіла, ёй бала ці паўбала не хапіла да бюджэту. Гэта не праблема — бацькі лёгка маглі плаціць за навучанне.

Мне не ўдалося паступіць у іняз, як марыла, але мае бацькі спакойна да гэтага паставіліся. Больш за тое, мая мама была ў шоку ад размоў Ленінай мамы і сказала мне: «Ты — наша любімая дачка, і мы цябе падтрымаем у любым выпадку, паступіш ты ці не».

Я пайшла працаваць на вытворчасць, думала, што на наступны год ізноў паспрабую паступаць. Але мне спадабалася працаваць, ды і даход меў значэнне. Яшчэ праз год прыйшло разуменне, што настаўнік замежнай мовы зарабляе менш за мяне. І галоўнае: мне ж ніхто не перашкаджае самастойна вывучаць замежныя мовы, чытаць кнігі, глядзець фільмы, і гэта мой выбар. А пры добрым заробку ездзіш у падарожжы і размаўляеш з носьбітамі моў. Разумееце, не кожны, хто любіць вершы, павінен стаць паэтам. На працягу 15 гадоў пасля заканчэння школы я памяняла чатыры месцы работы, і кожнае было лепш за папярэдняе. І мне падабаецца рабіць нешта новае. Некалькі маіх дыпламаваных аднакласнікаў і працу не любяць, і прыбыткам не задаволеныя, але ім страшна нешта мяняць у жыцці. Яны думаюць, што на вытворчасці «пыльна» ды і непрэстыжна. Насамрэч і чыста, і ўсё камп'ютарызавана, але даказваць ім нешта няма сэнсу.

А Лена год папрацавала пасля выпуску, сышла ў «дэкрэт», потым яшчэ год, і зноў «дэкрэт». Мне яна казала: «Нават у пальчатках баюся дакранацца да чужых людзей». Лене ўдалося перакваліфікавацца ва ўрача-статыстыка, і вось з лічбамі, графікамі, дакументамі ёй камфортна. Яна змагла знайсці выйсце і застацца ў медыцыне, а колькі такіх лекараў, якія вучыліся па патрабаванні бацькоў і пры першым зручным выпадку сыходзяць з прафесіі. Дарэчы, муж Лены — доктар у першым пакаленні. Як яна ім захапляецца! Кажа, не хацела б трапіць пацыентам да такога ўрача, якім была сама, а вось да свайго мужа — з вялікім задавальненнем.

Мама Лены да гэтага часу не можа супакоіцца. Жанчына ж марыла, што дачка будзе «ўсіх уладкоўваць па знаёмстве ў бальніцу», а не паперкі перабіраць. А Лена яшчэ і звяла да мінімуму зносіны з бацькамі, стаўшы замужняй жанчынай.

**«Некалькі маіх дыпламаваных аднакласнікаў і працу не любяць, і прыбыткам не задаволеныя, але ім страшна нешта мяняць у жыцці. Яны думаюць, што на вытворчасці «пыльна» ды і непрэстыжна».**

Мама Лены — не адзіная, хто выбірае дзецям прафесію. Гэта па прынцыпе: у самой не атрымалася, дык няхай хоць бы дзіця... Мая калега, у якой дзеці вучацца ў старэйшых класах, так і кажа: «Вядома, пытанне выбару прафесіі павінны вырашаць бацькі, хіба дзеці разумеюць, што ім трэба?» З такіх людзей і атрымліваюцца спецыялісты, якія праз сілу ходзяць на сваю работу. Яны самі жывуць у пастаянным стрэсе і псуюць жыццё навакольным. Цяпер жа ёсць магчымасць і тэсціраванне прайсці. Маёй дачцэ 12 гадоў, дык ёй амаль што кожны тыдзень падабаецца новая прафесія. Калі чалавек не вызначыўся, лепш пайсці працаваць, агледзецца, зразумець, да чаго душа ляжыць. Ды і не кожнаму патрэбна вышэйшая адукацыя. А бацькі прымушаюць паступаць у ВНУ нават троечнікаў. Па мне дык лепш быць добрым сантэхнікам, чым кепскім эканамістам.

У майго мужа таксама няма дыплома аб вышэйшай адукацыі, але ў яго шырокі кругагляд, з ім цікава, гэта па-першае. Па-другое, ён зарабляе ў разы больш, чым яго брат, які калісьці сказаў, што ў яго мара «атрымаць дыплом і сядзець у офісе».

Думаю, што зніжэнне колькасці месцаў у ВНУ будзе садзейнічаць таму, што стане менш уладальнікаў дыпломаў, якія не могуць ці не хочуць уладкоўвацца на работу па спецыяльнасці, а статус чалавека з вышэйшай адукацыяй не дазваляе ім працаваць рукамі.

**Ксенія КАВАЛЕЎСКАЯ.**